УДК 745/749(476/2)

Студ. А.С. Ільеня, А.С. Ільеня
Навук. кір. к.ф.н. ст. выкл. В.У. Русак
(кафедра беларускай філалогіі, БДТУ)

# РУЧНІКІ Ў ПАЎСЯДЗЁННЫМ ЖЫЦЦІ В. АЗЯРЫНЫ ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНА

Ткацтва – адно з самых старажытных і пашыраных рамёстваў на Беларусі. У шматлікіх пісьмовых крыніцах засведчана, што на нашай зямлі здаўна выраблялі кашулі і фартухі, сурвэткі, абрусы і, канечне, ручнікі. Якое месца ручнікі займаюць у жыцці сучаснага чалавека? Чым могуць яны прывабіць сёння? Адказы на гэтыя пытанні мы паспрабавалі даць, прааналізаваўшы выкарыстанне ручнікоў жыхарамі вёскі Азяраны Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Вёска Азяраны размешчана на правым беразе ракі Сцвіга, за 9 км на захад ад старажытнага горада Турава. Непадалёку працякае рака Прыпяць. Азяраны ўваходзяць у склад і з’яўляюцца цэнтрам Азяранскага сельскага савета. У вёсцы – 250 двароў, пражывае 608 жыхароў. У 2005 годзе вёсцы нададзены статус аграгарадка. У Азяранах ёсць Цэнтр рамёстваў, дзе працуюць выдатныя ткачыхі. Яны не толькі дасканала валодаюць майстэрствам ткання ручнікоў, але таксама захоўваюць і папулярызуюць сярод моладзі мясцовыя традыцыі ў выкарыстанні гэтых тканых вырабаў.

Народнае ткацтва выклікае значны інтарэс, таму што яно цесна звязана з гісторыяй народа і з’яўляецца каштоўным матэрыялам пры выхаванні грамадзяніна-патрыёта. Тканы льняны ручнік адлюстроўвае жыццё чалавека, яго светапогляд, адносіны да людзей. У кожнай мясцовасці раней былі свае асаблівасці прыёмаў ткацтва, вышыўкі і ўпрыгожвання ручнікоў. На жаль, багатыя традыцыі ў наш час беззваротна знікаюць. У сувязі з гэтым неабходна вывучаць, захоўваць і адраджаць забытыя традыцыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Ручнік – гэта маркіраваная арнаментам, колерам і іншымі сродкамі выразнасці тканіна, якая выкарыстоўвалася з утылітарнымі мэтамі, а таксама выконвала важныя рытуальна-сімвалічныя функцыі ў абрадах.

Беларускія ручнікі маюць даўнюю гісторыю. Так, яны згадваюцца ў дакументах гарадскіх судоў Мінска, Магілёва, Брэста, Гродна, Вільні, Слоніма, Віцебска і іншых гарадоў як папулярныя прадметы гарадскога і сялянскага побыту. Вядома, што ў Сярэднявеччы людзі карысталіся і простымі ўціральнікамі, і ўзорыста вышыванымі ручнікамі з хатняга

палатна. Ручнікі складалі пасаг і вясковай, і гарадской дзяўчыны, а таксама з'яўляліся прадметамі гандлю.

Яшчэ параўнальна нядаўна ручнікі выкарыстоўваліся беларусамі на працягу ўсяго жыцця: ад нараджэння да смерці. Так, на ручнік прымалі дзіця пры народзінах. Ручнікам адорвалі бабку-павітуху, кума і куму. Без ручніка не абыходзілася ніводнае вяселле: нявесце завязвалі ручнік на правай руцэ, і яна насіла яго на працягу ўсяго вяселля, маладога перапаясвалі ручніком; свата і ўдзельнікаў дружыны маладога перавязвалі ручніком праз правае плячо ці перакрыжоўвалі двума ручнікамі і г. д.

Ручнікі маюць разнастайнае лакальнае шматаблічча. Асаблівасці лакальных тыпаў ці варыянтаў ручнікоў выяўляюцца ў характары іх выкарыстання у паўсядзённым жыцці, абрадах і аздабленні імі покуці.

Праведзенае намі даследаванне паказала, што ў ваколіцах вёскі Азяраны ручнікі выкарыстоўваюцца жыхарамі вельмі часта, ёсць шмат умельцаў, якія стараюцца перадаць сваё майстэрства моладзі. Ручнікі жывуць у многіх сем'ях вёскі, прычым, не толькі ў якасці родавай рэліквіі, але і як прадметы хатняга ўжытку.

Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца ручнікі-***ўціральнікі***. Яны ўяўляюць сабой кавалкі тканіны без дэкору ці з вузенькімі палоскамі-ператыкамі па краях, выкарыстоўваюцца для побытавых патрэб (імі ў паўсядзённым жыцці выціраюць рукі і твар). Прычым на патрэбу сям'і звычайна выдзяляецца толькі адзін ручнік. Як правіла, ён вісіць пасярэдзіне сцяны.

Ручнік – абавязковы атрыбут многіх вясковых рытуалаў.

Так, спецыяльным ручнічком (у ваколіцах вёскі Азяраны ён называецца ***мятлік***) прыкрываюць дзіця на хрэсьбінах.

Абавязкова выкарыстоўваюцца тканыя ручнікі на ўсіх вяселлях, якія праводзяцца ў вёсцы. Напрыклад, пры вянчанні ў царкве маладыя становяцца на адзін ручнік (т. зв. ***падножнік***); спецыяльнай падвойнай наміткай (***павівалам***, ці ***завівалам***) звязваюць рукі жаніха і нявесты. Маладая ўваходзіць у хату маладога па палатне ці ручніку; сват вядзе на ручніку жаніха на «пасад» перад тым, як той адпраўляецца па нявесту; брат вядзе маладую на «пасад». Маладая вешае ручнік-***набожнік*** на абразы ў доме маладога, развешвае ручнікі на вокны, па сценах і т. п. Цікава, што ручнік жыхарамі Азяранаў успрымаецца і як магічны сродак: маладая па традыцыі цягне за сабой завязаны на руцэ ручнік або ручнік-падножнік у царкве, каб сяброўкі хутка выходзілі замуж.

Ручнікі – абавязковы атрыбут і пры пахаванні чалавека. У вёсцы Азяраны пры пахаванні ў дамавіну кладуць ручнік, канцы якога нярэдка

пакідаюць звонку. У такім выпадку ручнік сімвалізуе шлях, які злучае гэты і той свет, дарогу на той свет. Ручнік лічыцца прадметам, які спатрэбіцца нябожчыку на тым свеце, каб уціраццa. Акрамя таго, на ручніках-намітках або палатне ў Азяранах апускаюць труну ў магілу. А таксама на Радуніцу завязваюць ручнікі на надмагільныя крыжы і помнікі (такія ручнікі лічацца ахвярай памерлым продкам, знакам памяці аб іх і ўшанавання). У ваколіцах вёскі Азяраны здаўна выраблялі т. зв. ручнікі-***абыдзённікі.*** Ткаліся яны ў крызісныя сітуацыі (пад час засухі, эпідэмій, вайны, хваробы дзяцей). Такія ручнікі ткаліся за адзін дзень.

У Азяранах многія жанчыны ткалі і спецыяльныя ручнікі-***абярэгі*** для ўсёй сям'і. Выкарыстоўвалі іх для палягчэння родаў, пазбаўлення ад бясплоддзя, а таксама для захавання хатняй жывёлы і паляшэння дабрабыту. Гэтыя ручнікі трымалі за абразамі, але пры неабходнасці бралі з сабой у далёкую дарогу. Ручнікі-абярэгі пераходзілі з роду ў род, з пакалення ў пакаленне. У многіх сем'ях яны жывуць і па сённяшні дзень.

Вядомымі былі таксама ручнікі-***трапкачы*** (у іх насілі абед у поле; яны ўжываліся для выцірання посуду і рук); ручнікі-***надзежнікі*** (імі накрывалі дзяжу з цестам, а таксама выкарыстоўвалі на ўрачыстым паднашэнні гасцям каравая з хлебам-соллю); ручнікі-***намиткі*** (уяўлялі сабой тонкае палатно ад 2 да 5 метраў удаўжыню, вышытае на канцах; такія ручнікі насілі на галаве замужнія жанчыны).

У канцы XX ст. на Беларусі амаль цалкам прыпыніўся ручны выраб ручнікоў. І хоць сёння ручнікі амаль перасталі быць прадметамі хатняга ўжытку, у сучасным мадэрнізаваным грамадстве тканыя ручнікі з'яўляюцца не толькі музейнымі экспанатамі: у многіх сем'ях яны захоўваюцца як родавыя рэліквіі, напамін аб продках, а таксама выкарыстоўваюцца як святочна-дэкаратыўныя атрыбуты. Мы бачым падоўжаны кавалак узорыстай тканіны там, дзе святкуюцца радзіны і вяселле, сустракаем яго і на праводзінах у апошнюю дарогу.

Як паведамілі старэйшыя жыхары вёскі Азяраны, ручнікі трапляюць у сем'і вельмі проста: перадаюцца ў спадчыну ад старэйшых пакаленняў або дарацца сваякамі, якія да гэтага часу займаюцца ткацтвам. Ручнікі займаюць даволі бачнае і пачэснае месца. У Цэнтры рамёстваў вёскі Азяраны ручнікі гавораць з наведвальнікамі даволі зразумелай мовай па-майстэрску выкананых узораў, на дзіва ўдала падабраных фарбаў. Не зразумее іх толькі той, хто не ўмее адчуваць.